Created in Master PDF Editor - Demo Version

Брэсцкая аб`яднаная рэгіянальная арганізацыя Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Міжнародная Акадэмія вывучэння нацыянальных меншасцей

Беларускае аддзяленне Міжнароднай Акадэміі акмсялагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

Кніга VII

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ І ПОЛІКУЛЬТУРНАЯ ПАРАДЫГМА

Брэст
1996

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Тэматычны зборнік "Нацыянальная адукацыя і полікультурная парадыгма" - чарговае выданне па праблематыцы нацыянальнай школы, падрыхтаванае ў Брэсцкай аб'яднанай рэгіянальнай арганізацыі "Бацькаўшчына". Папярэднія шэсць кніг - "Адукацыя. Гісторыя. Мова" (1992 г.), "Асвета. Гісторыя. Мова" (1992 г.), "Нацыянальная адукацыя і пытанні беларускамоўнага выкладання" (1993 г.), "Нацыянальная адукацыя: гісторыя, сучаснасць, перспектывы (1995 г.)" у трох кнігах - ужо выкарыстоўваюцца навукоўцамі, выкладчыкамі, студэнтамі. У дадзеным зборніку разглядаюцца праблемы полікультурнай адукацыі ў нацыянальнай школе, разнастайныя аспекты рэгіянальнай адукацыі і перспектыў яе развіцця, актуальныя пытанні акмеялагічнай навукі.

У зборнік увайшлі матэрыялы навукоўцаў Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны - удзельнікаў 5-й Міжнароднай навуковай канферэнцыі па нацыянальнай адукацыі ў г. Брэсце 18-19 верасня 1996 г.

Навуковы рэдактар ЯЦКЕВІЧ С.Л.

© "Бацькаўшчына" (Брэст), 1996 г.



Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Эмануіл ЮФЕ, доктар гіст. навук, прафесар, акадэмік АНМ (Беларускі пед. ун-т, г.Мінск)

# АДРАДЖЭННЕ ЯЎРЭЙСКАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

У 20-30-я гады для падрыхтоўкі нацыянальных кадраў сярод яўрэйскага насельніцтва БССР былі створаны: яўрэйскае аддзяленне пры Беларускім дзярж. ун-це, Мінскі настаўніцкі ін-т нацыянальных меншасцей, яўрэйскае аддзяленне на педфаке БДУ, яўрэйскае аддзяленне ў Віцебскай саўпартшколе.

Канец 30-х гадоў стаў канцом яўрэйскай вышэйшай адукацыі на Беларусі.

Прайшло амаль шэсць дзесяцігоддзяў і 23 лютага 1995 г. у Мінску пачаў работу Яўрэйскі ун-т. Сімвалічна, што ён адкрыўся ў памяшканні былой вышэйшай партыйнай школы ЦК КПБ. У праграму вучэбных заняткаў Яўрэйскага ун-та ўключаны курсы: "Гісторыі яўрэяў у Беларусі", "Паэтыка Танаха", "Старажытная гісторыя яўрэйскага народа", "Гісторыя яўрэйскага мастацтва",



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

"Яўрэйская этнапсіхалогія", "Яўрэйскія традыцыі", спецкурс "Яўрэі - лаўрэаты Нобелеўскай прэміі", выкладанне іўрыта і англійскай мовы.

Нідзе ў свеце не вывучаецца ў такім вялікім аб'ёме "Гісторыя яўрэяў Беларусі". На яе адводзіцца 120 гадзін. Выкладае гэты курс прафесар, акадэмік Міжнароднай Акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей Э. Іофе. Храналагічна курс ахоплівае амаль тысячагадовы перыяд - ад X ст. ("Яўрэі ў Хазарскім каганаце", "Яўрэі ў Кіеве") да канца XX ст. Пры гэтым курс уключае лекцыі не толькі па гісторыі, але і па матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускіх яўрэяў, па іўдаізму і хасідызму. Выкладчык знаёміць студэнтаў з яўрэйскай літаратурай і мастацтвам, з укладам яўрэяў у беларускую і сусветную навуку.

Адным з цікавых курсаў Яўрэйскага ун-та ў Мінску з'яўляецца курс "Паэтыка Танаха" ("Гісторыя старажытнай яўрэйскай літаратуры"), які выкладае дацэнт філалагічнага фак-та БДУ Г. Сініла.

Шмат пазнавальнага для сябе знаходзяць студэнты Яўрэйскага ун-та ў лекцыях па яўрэйскай этнапсіхалогіі, якія чытае доктар псіхалагічных навук, акадэмік МААН Я. Каламінскі.

Сярод студэнтаў Яўрэйскага ун-та мы бачым не толькі яўрэяў, але і беларусаў, рускіх, палякаў, украінцаў. На пытанне, што прывяло іх, адказваюць: "Інтарэс да яўрэйскай гісторыі і культуры".

А цяпер параўнаем стан яўрэйскай вышэйшай адукацыі Беларусі ў 20-30-я і 90-я гады.

1. У 20-30-я гады яўрэйская вышэйшая адукацыя была дзённай, вячэрняй і завочнай. Сёння толькі вячэрняя (4 дні ў тыдзень).

2. Раней яўрэйская адукацыя фінансавалася за кошт дзяржавы, а цяпер - за кошт розных міжнародных арганізацый і замежных дзяржаў.

3. У 20-30-я гады выкладанне вялося на мове ідыш. Сёння яно вядзецца на рускай мове.

4. У 20-30-я гады падручнікі меліся амаль па ўсіх прадметах. Сёння, акрамя іўрыта, англійскай мовы, старажытнай гісторыі яўрэйскага народа, выкладанне вядзецца пры адсутнасці падручнікаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version